Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

7 СНЕЖНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 236 (28852)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЯКІ БІЗНЕС АДКРЫЦЬ НА ВЁСЦЫ

МС

ЧЫМ ЗАЙМАЕЦЦА БЕЛАРУСКІ ЧЫРВОНЫ КРЫЖ

МС

ЦЫТАТА ДНЯ

Тамара КРАСОЎСКАЯ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях:

«Парламентарыі прапануюць павысіць статус службы занятасці, зрабіць яе самастойнай структурай. Дзякуючы гэтаму яна зможа больш эфектыўна выконваць задачы, ускладзеныя на яе законам аб занятасці, Дзяржаўнай праграмай аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці на 2016—2020 гады, Дэкрэтам № 1. Акрамя таго, службе неабходна вярнуць шэраг кантрольных паўнамоцтваў. Напрыклад, раней яе прадстаўнікі выязджалі на прадпрыемствы, правяралі, ці запоўненая ўся штатная колькасць, ці правільна пададзеныя звесткі аб наяўнасці рабочых месцаў. Дэпутаты вывучаюць сітуацыю ў рэгіёнах і на гэтай падставе ўносяць прапановы аб паляпшэнні заканадаўства».

ДАРОГУ АДОЛЕЕ ТОЙ, ХТО ІДЗЕ

Прэзідэнт Беларусі прапанаваў канкрэтныя захады па вырашэнні найбольш вострых праблем ЕАЭС

Учора ў Санкт-Пецярбургу адбылося пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета, у якім узяў удзел Прэзідэнт Беларусі. Пасяджэнне пачалося значна пазней запланаванага часу. Меркавалася, што Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін паводле пратакола спачатку павітае кіраўнікоў дэлегацый, затым адразу адбудзецца цырымонія фатаграфавання, і яны накіруюцца на перагаворы. Аднак пасля сустрэчы з расійскім прэзідэнтам прайшла незапланаваная сустрэча кіраўнікоў дзяржаў за зачыненымі дзвярыма.

СТАР. 2

Фота БелТА.

ЦУДОЎНЫ ЧАС

У Мінску ў гандлёвым цэнтры «Сталіца» дадзены старт рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Цуды на Каляды». Мерапрыемствы будуць праходзіць у перыяд навагодніх і калядных свят да 9 студзеня 2019 года і папоўняць скарбонку добрых спраў усебеларускага праекта «Нашы дзеці». Па традыцыі валанцёры руху БРСМ «Добрае Сэрца» і цімураўцы БРПА ва ўсіх рэгіёнах краіны правядуць конкурсы, святочныя праграмы, арганізуюць адрасныя віншаванні для дзяцей, якія асабліва маюць у гэтым патрэбу, збяруць для іх падарункі.

Фота БелТА.

КОРАТКА

- **Беларусь прапануе распрацаваць усёабдымную і доўгатэрміновую стратэгію сістэмы ААН для краін з сярэднім узроўнем даходу.**
- Беларуская федэрацыя біятлона абвясціла конкурс на самы лепшы слоган да адкрытага чэмпіянату Еўропы па біятлоне 2019 года.
- **Рэалізацыя праекта «Рэканструкцыя ампульнай вытворчасці» завяршылася на ААТ «Барысаўскі завод медыцынскіх прэпаратаў».**

- Урад Расійскай Федэрацыі ўхваліў ратыфікацыю пагаднення з Беларуссю аб уездзе замежнікаў на спартыўныя мерапрыемствы.

Падпіска-2019

«УДАЛЫ ШОПІНГ СА «ЗВЯЗДОЙ»: ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

Ой «Звязда», мая «Звязда»,
Сто гадоў харошая!
На цябе, мая «Звязда»,
Не шкадую грошай я!

Гэтыя радкі неяк раз па тэлефоне «выдала» адна з вельмі даўніх падпісчыц і, згадзіцеся, мела рацыю, бо, апроч задавальнення пяць разоў на тыдзень атрымліваць газету і чытаць штось патрэбнае ды цікавае (прычым па-беларуску!), са «Звяздой» яшчэ можна і выйграць! Што канкрэтна? А на гэты раз — што пажадаеце (альбо — што вам трэба...).

Такую вось цудоўную магчымасць даюць уладальнікам падарункавыя сертыфікаты ўнівермага «Беларусь» на сто і трыста рублёў.

Што зрабіць для таго, каб іх выйграць? Нічога асаблівага. Як «спявалі» ў коле сяброўак іншыя нашы чытачкі:

«Пачакайце вы, гулёны,
Я на вуліцу пайду,
Там сустрэну паштальёна —
Падпішуся на «Звязду»...

Пасля чаго застанецца толькі запоўніць картку ўдзельніка рэкламнай гульні «Удалы шопінг са «Звяздой» (падрабязныя правілы змешчаны ў нумары за 6 снежня) і да 8 студзеня ўжо новага года (можна — разам з лістамі-віншаваннямі) даслаць у рэдакцыю, для таго, каб потым...

Розыгрыш прызоў адбудзецца 9 студзеня, падчас калядных свят, і некаму ў ім, вядома ж, пашанцуе. Цалкам магчыма — вам.

Картку ўдзельніка розыгрышу шукайце на першай старонцы «Тэлетыдня».

ISSN 1990 - 763X